ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1988
ЧАЦВЕР
24
ЛІСТАПАДА
№ 31 (1589)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## У наступным нумары чытайце:

Адцягваць студэнтаў у вучэбны час на ўсялякія работы і мерапрыемствы, якія не маюць сувязі з навучальным працэсам, лічыцца недапушчальным.

Недапушчальна. І безгаспадарча. Але гэтай восенню яны зноў працавалі на палях.

Дзяржкамітэт па народнай адукацыі выпусціў загад № 217. Ен даў студэнтам права не выходзіць на работы, не звязаныя са зборам ураджаю, пакідаць тыя гаспадаркі, дзе не падрыхтаваны нармальныя ўмовы для жыцця. Слова Дзяржкамітэта — закон для вышэйшай навучальнай установы, які ў той жа час ніяк не кранае кіраўнікоў гаспадарак. Таму

студэнты ўсё яшчэ вымушаны працаваць па прынцыпу: выкапай — закапай.

Нам здаецца, што праблема «бульбы» не з лёгкіх. Нам хацелася б, каб на яе звярнулі як мага больш увагі. У наступным нумары мы змяшчаем падборку матэрыялаў, падрыхтаваную з дапамогай лістоў-допісаў у рэдакцыю выкладчыкаў і студэнтаў, прысвечаную гэтай тэме.

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП «Учора · Сёння · Заўтра»

### НА ПАСЯДЖЭННІ

партыйнага камітэта БДУ зацверджаны наступныя камісіі:

— па пытаннях арганізацыйна-партыйнай работы і работы з кадрамі (старшыня камісіі — намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце В. А. Прокашава);

— ідэалагічная (старшыня — намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце М. Э. Часноўскі);

— па пытаннях вучэбнай і навуковай работы (старшыня — намеснік дырэктара НДІ ЯП М. М. Шумейка);

— па пытаннях прававога выхавання і прафілактыцы правапарушэнняў (старшыня — дэкан юрыдычнага факультэта В. Г. Ціхіня);

— па міжнародных сувязях і рабоце з замежнымі навучэнцамі (старшыня — загадчык кафедры факультэта радыёфізікі і электронікі І. А. Малевіч);

— па сацыяльна-эканамічнаму развіццю універсітэта (старшыня — загадчык лабараторыі НДІ ПФП П. Д. Кухарчык).

### САМЫЯ МУДРАГЕЛІСТЫЯ ПЫТАННІ

вы зможаце задаць (і тут жа пачуць адказ) пераможцам Усесаюзнага КВЗ-87 — камандзе Адэскага дзяржаўнага універсітэта. Сустрэча з ёй, арганізаваная Рэспубліканскім эксперыментальным маладзёжным цэнтрам «Арыенцір», пройдзе 26 лістапада ў актавай зале універсітэта а 14-й гадзіне.

## АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

17—18 лістапада праходзіла VI Маскоўская раённая канферэнцыя Камуністычнай партыі Беларусі горада Мінска.

18 лістапада адбыўся арганізацыйны пленум Маскоўскага раённага камітэта Кампартыі Беларусі г. Мінска.

Першым сакратаром райкома КПБ выбраны М. А. ЗАЛЕЎСКІ, другім сакратаром райкома КПБ — Л. Р. ГУБАНОВІЧ, сакратаром райкома КПБ — Т. У. ЗЛОБІНА.

**ЧЛЕНАМІ БЮРО МАСКОЎСКАГА РАЙКОМА КПБ ВЫБРАНЫ:**

Бельская Г. Я.— загадчыца верху абутку МВАА «Прамень»;

Гайсёнак В. А.— сакратар парткома БДУ імя У. І. Леніна;

Губановіч Л. Р.— другі сакратар райкома КПБ;

Гузанаў А. А.— старшыня выканкома райсавета народных дэпутатаў;

Залеўскі М. А.— першы сакратар райкома КПБ;

Злобіна Т. У.— сакратар райкома КПБ;

Крывец А. С.— першы сакратар райкома ЛКСМБ;

Мацко Л. М.— старшыня раённага камітэта народнага кантролю;

Мяцельскі У. М.— загадчык арганізацыйнага аддзела райкома КПБ;

Новікаў А. А.— дырэктар завода «Кінадэталь»;

Акановенка Г. Ф.— мантажніца радыёапаратуры завода «Калібр».

Загадчыкамі аддзелаў зацверджаны:

Мяцельскі У. М.— загадчык арганізацыйнага аддзела райкома КПБ;

Лушчыцкі У. Б.— загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома КПБ;

Краснеўская І. В.— загадчыца агульным аддзелам райкома КПБ.

Яхнавец Л. З.— старшыня партыйнай камісіі.

## ФОТА Ў НУМАР



— Яго работай я вельмі задаволены,— лаканічна адазваўся пра свайго намесніка па арганізацыйнай рабоце Ігара Рудакова сакратар камітэта камсамола хімфака Дзмітрый Жыткоўскі.— Ен адзін з тых, чыімі намаганнямі хімфак не сумуе. Камсамольцы добра памятаюць «зорныя» паходы, Дні хіміка, сустрэчы з ветэранамі, дыскатэкі.

Фота С. ГРЫЦА.

## З КАМПЕТЭНТНЫХ КРЫНІЦ

*«Таварыства апекі аб параненых і хворых воінах» — пад такой назвай 125 гадоў назад нарадзіўся рух Чырвонага Крыжа. Ініцыятарам яго стварэння быў вядомы швейцарскі дзеяч Анры Дзюнан.*

*Ініцыятыва Анры Дзюнана была падтрымана практычна ва ўсіх краінах Еўропы, у тым ліку і ў Расіі.*

*Пасля Вялікага Кастрычніка Чырвоны Крыж стаў у нашай краіне адной з самых масавых і папулярных грамадскіх арганізацый. На яго сродкі пабудаваны вядомы піянерскі лагер «Артэк» і многія іншыя аздараўленчыя ўстановы для дзяцей, створана санітарная авіяцыя, вяліся процізпідэмічныя работы.*

*У ліку членаў гарадской арганізацыі Чырвонага Крыжа — 54 тысячы студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў.*

# Місія дабра і міласэрнасці

НА ЖАЛЬ, не сакрэт, што ўдзел большасці людзей у дзейнасці Чырвонага Крыжа зводзіцца да ўплаты штогод членскіх узносаў у памеры 30 капеек. Многія студэнты фармальна з'яўляюцца членамі таварыства і ніякай работы не вядуць. У першую чаргу — гэта следства нашых агульных недапрацовак. Мала мы займаемся прапагандай дабрачыннай дзейнасці Чырвонага Крыжа. Некаторыя нашы супрацоўнікі прывыклі да «кабінетнага» стылю работы, рэдка бываюць у пярвічных арганізацыях, у студэнцкіх калектывах.

Але будзем аб'ектыўнымі. На рахунку арганізацыі — шмат добрых спраў. Адна з іх — донарства. Сёння ахова здароўя практычна не адчувае недахопу ў «чужой» крыві. Звыш 100 тысяч членаў Таварыства штогод здаюць кроў. Гэта сапраўды мужныя людзі, вартыя самай высокай павагі за сваю дабрыню, бескарыслівасць і высакароднасць.

Сярод іх і студэнты нашага універсітэта. Можна назваць сотні юнакоў і дзяўчат, якія з'яўляюцца актыўнымі донарамі. Сярод іх Анатоль Буцянец, Святлана Якубоўская, Вольга Хлус (біяфак); Эдуард Далінскі, Станіслаў Коцікаў, Саід Муталімаў, Валянціна Шчацініна, Канстанцін Лазаванц (гістфак); Андрэй Кашчэй, Юрый Каладко (геафак); Уладзімір Лупін, Ларыса Хлусевіч (факультэт радыёфізікі і электронікі); Андрэй Каскевіч, Яўген Хурсін, Дзмітрый Бабко (фізфак); Міхаіл Няўдах, Ларыса Жынко (юрфак) і многія іншыя.

Больш двухсот студэнтаў універсітэта ўзнагароджаны знакамі «Донар СССР» першай, другой і трэцяй ступеняў.

Аднак донарскі рух ва універсітэце яшчэ не набыў масавага характару. У 1987 годзе колькасць донараў рэзка знізілася, а ў гэтым годзе БДУ заняў адно з апошніх месц сярод ВНУ горада.

Але донарства не адзіны трывожны момант у дзейнасці пярвічнай арганізацыі ТЧК БДУ. Есць цяжкасці і са зборам членскіх узносаў. У многіх студэнтаў узнікаюць пытанні, куды расходуюцца гэтыя сродкі.

Прыярытэтным напрамкам сваёй дзейнасці Чырвоны Крыж лічыць клопат аб адзінокіх састарэлых, інвалідах вайны і працы.

У паўтарамільённым горадзе, дзе колькасць адзінокіх старых, якія маюць патрэбу ў дапамозе, інвалідаў складае некалькі тысяч, працуе ўсяго 49 патранажных сясцёр, на ўтрыманне якіх затрачваецца 60 тысяч рублёў. Але колькасць сясцёр павялічыць нельга — бюджэт не дазваляе, ён складаецца з трыццацікапеечных узносаў і налічвае каля 200 тысяч рублёў.

З паступіўшых узносаў аказваецца матэрыяльная дапамога малазабяспечаным грамадзянам. А для таго, каб аказаць чалавеку дапамогу ў памеры 50 рублёў, патрэбна ўплата членскіх узносаў па 30 капеек 170 членаў Таварыства.

У 1986 годзе гарадскі камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа аказаў матэрыяльную дапамогу на суму больш 40 тыс. рублёў эвакуіраваным з Гомельскай вобласці ў Мінск у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

Пэўная колькасць грошай адводзіцца на выпуск санітарна-асветніцкай літаратуры, арганізацыю спаборніцтваў сандружын і санпастоў, злётаў донараў.

У 1987 годзе гарадскі камітэт ТЧК аказаў дапамогу двум дамам сірат, набыўшы цацкі.

Частка грошай Таварыства Чырвонага Крыжа Беларусі пералічваецца ў Фонд Савецкага Чырвонага Крыжа.

Савецкі Чырвоны Крыж мае два санаторыі, дзе лечацца барацьбіты за мір і разрадку з іншых краін, дзве інтэрнацыянальныя школы для дзяцей, бацькі якіх загінулі ў барацьбе за мір і прагрэс. Знаходзяцца яны ў Саратаве і Ташкенце і існуюць на сродкі Чырвонага Крыжа.

А вось падзеі апошніх дзён: Савецкі Чырвоны Крыж працягвае руку дапамогі народу Нікарагуа, на які абрушылася стыхійнае бедства. А гэта ж часцінка і нашых узносаў.

Таму заклікаю ўступіць у рады членаў Чырвонага Крыжа усіх тых, хто хоча адклікнуцца на чужы боль, хто неабыякавы да няшчасця іншых.

Н. ЗДАНЮК,
старшыня Маскоўскага раённага
Таварыства камітэта Таварыства
Чырвонага Крыжа
г. Мінска.

# Аб чым спрачаліся ў Стайках?

11—13 ЛІСТАПАДА ў Стайках праходзіла вучоба камсамольскага актыву. Якім павінен быць ВЛКСМ? Што можа ён як палітычная сіла? Як працаваць з нефармальнымі аб'яднаннямі?.. Пытанняў было шмат. На іх спрабавалі знайсці адказы.

Абмеркаванне некаторых пытанняў выходзіла за рамкі традыцыйна-застойнага даклада. Так, напрыклад, выступленне сакратара ЦК ЛКСМБ Міхаіла Падгайнага па праблемах нефармальнага руху перарасло ў ажыўленую дыскусію. Камсамольскія лідэры выказвалі свае думкі, прапаноўвалі шляхі супрацоўніцтва з нефармальнымі групоўкамі,— словам, размова атрымалася вельмі цікавай.

Не менш горача прайшоў дыялог з кіраўніком клуба «Палітыкус» Ігарам Велічанскім. Палітызацыя, самастойнасць камсамола — гэтыя праблемы даўно хвалююць камсамольцаў і ў час вучобы сталі бадай што аднымі з самых важных, набалелых. Таму падчас выступленні многіх удзельнікаў былі эмацыянальнымі, крыху максімалістскімі. Аднак у іх праяўлялася актыўная грамадзянская пазіцыя, жаданне выправіць становішча, што склалася ў камсамоле, імкненне да канкрэтнай і карыснай справы.

Не абмінулі ўдзельнікі вучобы і праблемы навучання. Разам з рэктарам універсітэта, акадэмікам АН БССР Л. І. Кісялеўскім і сакратаром парткома В. А. Гайсёнкам абмеркавалі шэраг пытанняў адукацыі, далейшай перабудовы ВНУ, узаемадзеяння партыйнага бюро і камітэтаў камсамола факультэтаў.

А. ПАТРЭБІН,
член камітэта камсамола
факультэта журналістыкі.

## КЛАПОЦІЦЦА ПРАФСАЮЗ

# КАБ НЕ ПАЎТАРЫЦЬ ПАМЫЛАК

НІКОГА не патрэбна пераконваць у тым, што ад супрацоўніка можна чакаць максімальнай аддачы толькі тады, калі яму створаны аптымальныя ўмовы для работы. Таму пытанні аховы працы, тэхнікі бяспекі маюць для прафсаюзнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна першаступеннае значэнне. Безумоўна, ёсць у нас пэўныя дасягненні, але і праблем хапае.

Штогод прафком і адміністрацыя універсітэта заключаюць «Пагадненне па ахове працы», у якім вызначаецца пералік асноўных мерапрыемстваў, што абавязуецца выканаць адміністрацыя на працягу года для паляпшэння ўмоў работы супрацоўнікаў. Паколькі універсітэт — гэта велізарная гаспадарка, якая ўключае акрамя дванаццаці факультэтаў шматлікія дапаможныя падраздзяленні, відавочна, што ўжо толькі адбор мерапрыемстваў для ўключэння ў пагадненне ўяўляе вялікую цяжкасць. Для таго, каб выканаць гэту работу найбольш аб'ектыўна, прафсаюзны камітэт збірае прапановы ад падраздзяленняў універсітэта, абмяркоўвае іх са службамі прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, ацэньвае магчымасць, тэрміновасць выканання, фінансавы бок справы і г. д. У выніку такой работы выяўляюцца найбольш важныя мерапрыемствы, якія ўключаюцца ў «Пагадненне». У мінулым годзе іх было запланавана 24 на агульную суму 21 тыс. 450 рублёў, у гэтым — 38 на суму 39 тыс. 340 руб

Вядома, усе пункты данага дакумента мы павінны выконваць. Але здараецца і такое, што па тых ці іншых прычынах мы не можам гэтага зрабіць. Так, напрыклад, у 1987 годзе мы не выканалі трох пунктаў пагаднення. Іх рэалізацыя была перанесена на гэты год.

Якія ж найбольш важныя і складаныя пытанні вырашаем мы сёння? Клапоцімся аб асветленасці аўдыторый, лабараторый, чытальных залаў і іншых памяшканняў. Патрэбна сказаць, што гэта якраз тое пытанне, якому ўдзяляецца пастаянная ўвага і якое патрабуе значных фінансавых сродкаў. Толькі за 1987—1988 гады на паляпшэнне асветленасці было затрачана больш 33,5 тысячы рублёў. Аднак заўваг з боку студэнтаў і выкладчыкаў яшчэ хапае.

Шмат даводзіцца працаваць над паляпшэннем умоў працы на хімфаку. Справа ў тым, што практычна з моманту эксплуатацыі корпуса ў ім не працавала прыточная вентыляцыя, адсутнічалі сіфоны ў ракавінах лабараторных памяшканняў. Таму сёння вельмі часта адзначаецца ў паветры наяўнасць павышаных канцэнтрацый шкодных і дрэнна пахнучых рэчываў. Шмат часу і сіл давялося патраціць, каб выправіць становішча. Зараз вентыляцыя тут адрамантавана і ўмовы працы палепшыліся. Праўда, восенню і ранняй вясной яны зноў маюць тэндэнцыю адхіляцца ў бок са знакам мінус. Прычына гэтаму — нестабільная тэмпература паветра на двары (не мае патрэбы тлумачыць чыста тэхнічныя нюансы — спецыялісты іх ведаюць).

Цесна пераплятаецца з вышэйназванай і яшчэ адна не менш важная праблема — зліву адыходаў хімічных эксперыментаў. Ужо шмат гадоў вырашаецца пытанне аб стварэнні палігона па знішчэнню хімічных адыходаў прадпрыемстваў Мінска. Аднак да гэтага часу справа не зрушылася з мёртвай кропкі. На хімфаку яны зліваюцца ў агульную каналізацыйную сетку, што яшчэ больш забруджвае атмасферу ў корпусе, бо выцяжная вентыляцыя разносіць смурод па ўсяму будынку. У якасці часовай меры ў гэтым годзе атрыманы дазвол частку гаручых адыходаў спальваць. Аднак гэта не з'яўляецца канчатковым вырашэннем праблемы.

Шмат цяжкасцей і ў біялагічным корпусе, першапачатковы праект якога не прадугледжваў размяшчэння ў ім біяфака. Яны зноў жа датычаць работы вентыляцыі, зліву адыходаў і г. д. Усё гэта, зразумела, адмоўна ўплывае на работу супрацоўнікаў факультэта і патрабуе значных фінансавых і працоўных затрат.

Тут акрэслены найбольш цяжкія, на наш погляд, пытанні, якія даводзіцца вырашаць прафсаюзнаму камітэту. Хоць, пэўна, кожны супрацоўнік любога падраздзялення можа назваць і шмат іншых. У сувязі з гэтым хацелася выказаць прапанову, рэалізацыя якой дапамагла б значна палепшыць стан спраў у гэтым напрамку.

Многія цяжкасці выкліканы не зусім якаснай работай адпаведных універсітэцкіх служб, якія павінны выконваць тыя ці іншыя мерапрыемствы па паляпшэнню ўмоў працы. Так, напрыклад, у службе галоўнага энергетыка электрыкі ў асноўным працуюць на палову стаўкі. Таму, з аднаго боку, яны проста не паспяваюць ахапіць увесь аб'ём работы, з другога — на такіх людзей і ўздзейнічаць даволі складана. Аналагічныя беды характэрны і для іншых служб. Таму, думаецца, універсітэту неабходна мець сваю арганізацыю (нешта накшталт будаўніча-мантажнага ўпраўлення), з адпаведным штатам, вытворчымі магутнасцямі і г. д., якая магла б вырашаць усе пералічаныя (і не толькі) задачы больш эфектыўна. Зрабіць гэта вельмі неабходна, бо зараз вядзецца будаўніцтва буйнога універсітэцкага гарадка. Пройдзе дзесяць-пятнаццаць гадоў, і ўсе гэтыя праблемы могуць паўстаць з яшчэ большай вастрынёй.

**А. ПАЎЛАЎ,**
старшы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП,
старшыня камісіі аховы працы і ТБ прафкома супрацоўнікаў.



## УВАГА: ЦІКАВЫ ВОПЫТ!

# Колькасць і якасць плюс аб'ектыўнасць

НАТУРАЛЬНА, што адэкватная ацэнка шматаспектнай і комплекснай дзейнасці выкладчыка, які вырашае складаныя і разнастайныя праблемы ў працэсе вучэбнай і выхаваўчай работы, павінна ўлічваць перш за ўсё якасныя характарыстыкі гэтай дзейнасці. Аднак якасны аналіз не азначае адсутнасць дакладна фіксаваных колькасных індыкатараў ацэнкі розных відаў працы выкладчыка. Больш таго, такія колькасныя ацэнкі неабходныя, каб ажыццявіць аб'ектыўную экспертызу вынікаў дзейнасці кожнага члена калектыву і пазбегнуць пры гэтым магчымых элементаў суб'ектывізму і тэндэнцыйнасці. Акцэнт павінен быць зроблены на колькаснае ранжыраванне іменна тых паказчыкаў у рабоце выкладчыка, якія адлюстроўваюць якасны ўзровень яго дзейнасці.

У гэтым плане можа быць цікавым вопыт арганізацыі і падвядзення вынікаў спаборніцтва паміж супрацоўнікамі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў. Пачынаючы з 1980 года ў калектыве гэтай кафедры (прафорг М. А. Мажэйка) апрабіравана распрацаваная В. С. Сцёпіным, А. І. Зелянковым і А. А. Дудко методыка, якая дазволіла арганізаваць спаборніцтва на якасна новым узроўні і дасягнуць значных поспехаў у асноўных напрамках вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і ідэйна-выхаваўчай работы.

«Методыка падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва сярод супрацоўнікаў кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў» складзена такім чынам, каб былі бачны якасныя параметры кожнага члена кафедры ў рабоце калектыву. Указаная методыка з'яўляецца састаўной часткай прынятага на сходзе членаў працоўнага калектыву палажэння аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Асноўныя паказчыкі працоўнага ўдзелу кожнага ў рабоце калектыву адлюстроўваюць спецыфіку дзейнасці выкладчыкаў грамадскіх навук: вучэбная работа і выкананне вучэбнай нагрузкі; вучэбна-метадычная і арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў; навукова-даследчая работа выкладчыка; грамадска-палітычная і ідэйна-выхаваўчая работа.

Пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва ўлічваецца не толькі агульная вучэбная нагрузка, выкананая выкладчыкам на працягу вучэбнага года, але і, у першую чаргу, ацэньваюцца якасныя параметры гэтай работы (вынікі абмеркавання адкрытых лекцый і семінараў). У асобную групу выдзяляюцца спецкурсы і семінары.

Важным напрамкам прафесійнай дзейнасці выкладчыка з'яўляецца вучэбна-метадычная і навукова-даследчая работа. Удасканаленне форм і метадаў выкладання грамадскіх навук, арганізацыя кантролю за самастойнай работай студэнтаў патрабуюць перабудовы праграм курсаў і спецкурсаў, распрацоўкі новых методык і метадычных дапаможнікаў. У працэсе падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва ўлічваецца распрацоўка новых лекцыйных курсаў і спецкурсаў, наглядных дапаможнікаў, выданне метадычнай літаратуры, планаў семінарскіх заняткаў, праграм спецкурсаў, публікацыя навукова-метадычных артыкулаў, тэзісаў, арганізацыя і правядзенне студэнцкіх навуковых канферэнцый.

Улік якасных характарыстык ажыццяўляецца шляхам дыферэнцыяцыі ацэнкі розных відаў публікацый (манаграфіі, раздзелы ў манаграфіі, артыкулы, тэзісы), прымаецца да ўвагі характар выдання (цэнтральнае, мясцовае, дэпаніраванне) і наяўнасць апублікаваных у справаздачным годзе рэцэнзій на навуковую прадукцыю выкладчыка кафедры. Дыферэнцыравана ацэньваецца навукова-даследчая работа студэнтаў (выступленні з дакладамі на універсітэцкіх, міжвузаўскіх, рэспубліканскіх канферэнцыях), улічваюцца вынікі рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў студэнцкіх работ па грамадскіх навуках.

Раздзел па грамадска-палітычнай і ідэйна-выхаваўчай рабоце супрацоўнікаў кафедры ўключае выкананне даручэнняў партыйных органаў і іншых грамадскіх арганізацый, дзейнасць, звязаную з прапагандай марксісцка-ленінскай тэорыі сярод насельніцтва. Асобнае месца займае ідэйна-выхаваўчая і прапагандысцкая работа сярод студэнтаў (кіраўнікі студэнцкіх навуковых гурткоў, дыскусійных клубаў; удзел у арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, «круглых сталоў», вечароў пытанняў і адказаў, сустрэч у студэнцкіх інтэрнатах, вечароў інтэрнацыянальнай дружбы).

Для ацэнкі рэзультатаў па розных відах дзейнасці ў якасці эквіваленту і базы адліку выступаюць адна акадэмічная гадзіна прачытанай лекцыі і адзін друкаваны аркуш навуковай прадукцыі. Да гэтых эквівалентаў прыраўноўваюцца (цераз адпаведныя каэфіцыенты) удзел у навуковых і метадычных канферэнцыях, выступленні з лекцыямі перад насельніцтвам, напісанне водгукаў на дысертацыйныя работы і манаграфіі і г. д. У канцы года супрацоўнікі кафедры складаюць індывідуальныя справаздачы, якія і з'яўляюцца асновай для вызначэння сумарнай ацэнкі работы выкладчыка. Пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва кожны супрацоўнік мае магчымасць азнаёміцца з папярэднімі рэзультатамі.

Арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва на кафедры ажыццяўляецца такім чынам, каб максімальна стымуляваць дзейнасць кожнага выкладчыка, садзейнічаць сістэматычнаму павышэнню індэкса яго працоўнага ўдзелу ў рабоце калектыву. Не сакрэт, што выкладчыку кафедры цяжка разлічваць на поспех ў спаборніцтве з прафесарам і дацэнтам. Выкладчыкі, якія не маюць вучоных ступеней, як правіла, не выконваюць пэўных відаў работ: чытанне спецкурса, правядзенне спецсемінара, кіраўніцтва дысертацыйнымі работамі і інш. Пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва методыка дае магчымасць вызначаць пераможцамі не толькі тых, хто набраў большую суму балаў, але і тых членаў кафедры, якія працавалі найбольш інтэнсіўна і дасягнулі прагрэсу ў параўнанні са сваімі мінулагоднімі паказчыкамі.

Такім чынам, дадзеная методыка не толькі вызначае аб'ектыўную сістэму крытэрыяў для ацэнкі рэзультатаў дзейнасці членаў калектыву, не толькі забяспечвае поўную галоснасць падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, але і дае магчымасць прааналізаваць змены ў інтэнсіўнасці работы кожнага канкрэтнага выкладчыка. Апошні спаборнічае не толькі з калегамі, але і можа ацаніць колькасныя і якасныя параметры сваёй работы ў параўнанні з мінулагоднім узроўнем.

Методыка дазваляе таксама прааналізаваць дынаміку вынікаў работы калектыву ў цэлым. З яе дапамогай мы можам наглядна супаставіць паказчыкі і ацаніць рост інтэнсіўнасці дзейнасці калектыву.

**А. ДУДКО,**
дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, член прафкома.

**М. МАЖЭЙКА,**
дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, прафорг кафедры.

## ШТО ПАКАЗАЛА КАНФЕРЭНЦЫЯ

# Пошук новых шляхоў

СПРАВАЗДАЧНАЯ канферэнцыя прафсаюзнай арганізацыі кафедраў грамадскіх навук не толькі падвяла вынікі двухгадовай работы, але і прымусіла яшчэ раз на традыцыйныя пытанні паглядзець па-новаму. Перш за ўсё гэта датычыць арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. У аснове яго тут ставяць не паказчык выканання сацыялістычных абавязацельстваў у той ці іншай канкрэтнай галіне, а канчатковы вынік усёй шматпрофільнай работы кафедраў. Вынікі спаборніцтва — гэта сістэма колькасных і якасных ацэнак дзейнасці выкладчыцкага калектыву ў цэлым. У такім выпадку паўстае пытанне: чаму спаборніцтва — справа прафсаюзаў, а не адміністрацыі? У многіх сацыялістычных краінах гэтым займаецца іменна адміністрацыя, а прафсаюзы сочаць за тым, каб спаборніцтва не прыводзіла да перанапружанасці працоўных, забяспечваліся ўсе неабходныя ўмовы нармальнай працы і адпачынку. Мэта прафсаюзаў у ВНУ — не выкананне планаў работы кафедраў. Іх павінен цікавіць якасны бок справы: як забяспечваецца рост кваліфікацыі выкладчыкаў, ці не ўшчамляюцца іх інтарэсы пры правядзенні атэстацый, конкурсаў і г. д.

З верасня наступнага года плануецца перавод ВНУ на дыферэнцыраваную аплату працы выкладчыкаў. Гэта складаны, асабліва псіхалагічна, працэс. Тут павінны быць дакладныя асновы, поўная галоснасць і дэмакратызацыя. Вось дзе спаборніцтва сыграла б важную ролю, калі б яно было справай адміністрацыі. Лепш працуе калектыў — большы фонд яго заработнай платы, вышэй узровень даходаў тых выкладчыкаў, якія забяспечваюць поспех калектыву. У дадзенай сітуацыі, калі паказчыкі работы кафедраў захоўваюцца ў прафсаюзных падраздзяленнях, дыферэнцыяцыя аплаты можа ажыццяўляцца на аснове існуючага фонду ў адпаведнасці са штатным раскладам і шляхам укаранення пераразмеркавання. І ў гэтым выпадку прафсаюз павінен клапаціцца аб максімальнай справядлівасці.

Абмяркоўваючы праблемы самакіравання кафедраў, мы не абмінулі і пытання аб савеце працоўнага калектыву. Прафесар А. М. Елсукоў, выступаючы на канферэнцыі, звярнуў увагу на тое, што ўзаемаадносіны кіраўніка, актыву (парторга, прафорга, намеснікаў) з астатнімі членамі кафедры далёка не заўсёды бесканфліктныя. Таму на кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў у мэтах найбольш эфектыўнага і дэмакратычнага вырашэння кадравай палітыкі, стылю кіраўніцтва створаны савет працоўнага калектыву. Знаёмства з яго работай, думаецца, будзе карысным і для іншых. Але гэта не азначае, што далейшая дэмакратызацыя работы павінна ісці іменна па гэтаму шляху.

**Я. ВАСІЛЬЕВА.**

**ПАПРАЎКА**

У нумары за 3 лістапада гэтага года (№ 29) па віне парткома і рэдакцыі газеты ў спіс саставу партыйнага камітэта было памылкова ўнесена прозвішча М. М. Федзяні.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона» зорка» МВПА імя Я. Коласа.
24 лістапада
Зак. 1637.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.